шматзначнасць, выключэнне сінонімаў. У якасці крыніц апорных слоў для мінімумаў уяўляецца мэтазгодным выкарыстоўваць аўтарытэтныя слоўнікі. Пры гэтым атрыманы спіс можна лічыць ядром, які пашыраецца падчас практычных заняткаў за кошт спалучальнай магчамасці моўных адзінак.

Варта адзначыць, што падрыхтоўка лексікаграфічных твораў для студэнтаў-нефілолагаў мае таксама свае адметнасці. Па-першае, неабходнасць укладання твораў слоўнікавага тыпу для нефілалагічных спецыяльнасцей узнікае на прасунутым этапе, паколькі на пачатковым навучэнцы засвойваюць нетэрміналагічную лексіку. Па-другое, слоўнікі філалагічнага тыпу: тлумачальныя, фразеалагічныя, амонімаў, паронімаў, сінонімаў і г. д. пры засваенні спецыяльнасці выконваюць другасную ролю. Студэнты-нефілолагі зацікаўлены найперш у выкарыстанні галіновых слоўнікаў, матэрыял якіх у навучальных мэтах павінен мінімізавацца.

Такім чынам, разглядаючы праблемы арганізацыі лексікаграфічнага забеспячэння курса “Беларуская мова як замежная”, можна зрабіць выснову, што даведнікі і слоўнікавыя матэрыялы featured рознага характару могуць служыць значным дапаўненнем да тэарэтычна-практычнага курса, задача іх распрацоўкі выступае актуальнай, і яе вырашэнне можа значна ўплываць наогул на адметнасці апісання лексікі ў навучальных мэтах.

**Літаратура**


1. Бархударов С.Г., Новиков Л.А. Каким должен быть учебный словарь? // Рус. яз. за рубежом. 1971. № 3. С. 5–14.
2. Морковкин В.В. О базовом лексикографическом значении // Учебники и словари в системе средств обучения русскому языку как иностранному. М., 1986. С. 102–117.


**Т.В. Мальцэвіч**

## ЖАНРАВА-КАМУНІКАТЫЎНЫ АСПЕКТ ВЫВУЧЭННЯ ПУБЛІЦЫСТЫЧНАГА СТЫЛЮ НА УРОКАХ РОДНАЙ МОВЫ

Функцыянальны стыль існуе як сукупнасць жанраў – тэкстаў, пабудаваных у адпаведнасці з пэўнай структурна-семантычнай мадэллю. Таму адметныя рысы публіцыстычнага стылю вынікаюць з сукупнасці індывідуальных асаблівасцяў жанраў публіцыстыкі ў іх тыпалагічнай скіраванасці. На фарміраванне жанрава-тыпалагічных рысаў уплывае суадноснасць стылістычных катэгорый, у тым ліку аб’ектыунага і

суб’ектыўнага, вобразнасці і выразнасці, рацыянальнага і эмацыянальнага, ступені і характара ўмоўнасці. Моўныя і структурна-семантычныя асаблівасці жанраў публіцыстыкі істотна адрозніваюцца, сведчаннем таму з’яўляецца падзяленне іх на групы: аналітычную, інфармацыйную і мастацка-публіцыстычную. Але гэта не супярэчыць ідэі адзінства стылю, бо па-за тэкстамі пэўных жанраў публіцыстычны стыль існуе толькі як абстракцыя, як агульнае ўяўленне аб моўным і маўленчым абрысе літаратурнай мовы.

Спынімся на жанрах аналітычнай групы, якія з’яўляюцца дамінуючымі літаратурнымі формамі публіцыстыкі. Галоўнае іх прызначэнне і метад – аналіз фактаў, з’яў і сітуацый рэчаіснасці. Калі ў аснове інфармацыйных жанраў, мэта якіх – паведамляць пра факты, ляжаць такія спосабы адлюстравання рэчаіснасці, як фіксацыя, канстатацыя, дэталізацыя канкрэтных фактаў, то для аналітычных жанраў, мэта якіх – даць тлумачэнне факту, характэрна наяўнасць аналітычнай структуры – аргументацыі. У працэсе разработкі тэмы аўтар складае сістэму фактаў і абапіраецца на яе ў сваіх меркаваннях, высновах, гіпотэзах, дапушчэннях такім чынам, каб зацвердзіць і распаўсюдзіць сваю пазіцыю, зрабіць чытачоў аднадумцамі. Эфектыўнасць аналітычных тэкстаў тоесна складаемым публіцыстычнага адлюстравання рэчаіснасці: фактычнай аснове, глыбока распрацаванай актуальнай тэме і эмацыянальнасці аўтарскага маналога.

Размеркаванне жанраў публіцыстыкі ўяўляецца важным таму, што дзякуючы выяўленню структуры жанру, яго тыпалагічных асаблівасцяў у працэсе аналіза тэкстаў можна зрабіць высновы аб прынцыпах пабудовы твораў пэўнага жанру і даць метадычныя рэкамендацыі.

Тэкст разглядаецца намі як сацыяльна-маўленчая з’ява, дыскурс. Таму недастаткова апісваць яго ў межах граматыкі, без уліку экстралінгвістычных фактараў. Комплексны аналіз дазваляе разгледзець тэкст як складаную арганізацыю сэнсавых, структурных і маўленчых элементаў, прасачыць стылістычную афарбаванасць моўных сродкаў у разгортванні зместавай структуры паведамлення. Вылучэнне кампазіцыйных элементаў дазваляе дзяліць тэкст з мінімальнымі парушэннямі яго семантыкі і разглядаць вылучаемыя адзінкі тэксту ў напрамку іх функцыянальнасці. Галоўнае – вылучэнне спецыфічных структурна-семантычных адзінак і вызначэнне іх кампазіцыйных тыпаў для адпаведнага жанру.

Даследаванне мноства тэкстаў жанру праблемнага артыкула паказала, што жанраваральнымі элементамі з’яўляюцца пастаноўка праблемы, разгляд аспектаў праблемы, указанне прычыны ўзнікнення праблемы, вызначэнне напрамкаў нейтралізацыі праблемы. Так, **пастаноўка праблемы** з’яўляецца ініцыяльнай часткай тэксту і змяшчаецца ў загалоўку, лідзе і ў абзацы-пралогу. Функцыя загалоўка – прыцягнуць увагу, абазначыць праблему альбо толькі даць намёк на яе і такім чынам заінтрыгаваць чытача. Загалоўку ўласцівы вобразныя выразы, фразеалагізмы, афарызмы, кантрастныя спалучэнні слоў. Пасля загалоўка звычайна змешчаны лід – абзац, у якім засяроджаны ключавыя элементы зместу (усе альбо некалькі): хто, што, дзе, калі, як, чаму. Лід акумуліруе цэнтральную праблему. Абзац-пралог раскрывае прычыны ўзнікнення праблемы або канкрэтызуе праблему. Звычайна пастаноўка праблемы як структурны кампанент тэксту змяшчае галоўны тэзіс.

Распрацоўка праблемы з’яўляецца самай аб’ёмнай і значнай часткай тэксту, у якой вылучаюцца асобныя аспекты праблемы. Функцыя гэтага структурнага кампанента тэксту – паказаць значнасць і актуальнасць узнятага пытання, зацвердзіць аўтарскую пазіцыю (погляд аўтара на праблему), абвергнуць антытэзіс, абаснаваць вывады. Тут змяшчаецца разгорнутая сістэма аргументацыі – доказ галоўнага тэзіса.

Заключная частка тэксту (вызначэнне напрамкаў нейтралізацыі праблемы) – гэта высновы, вывад на аснове распрацаванай сістэмы аргументаў. У межах цэлага тэксту кожны семантычна значны адрэзак становіцца аргументам у паслядоўным ланцугу разважання і непасрэдна альбо апасродкавана звязаны з пастаўленай у артыкуле праблемай. Паколькі аргументацыя складае ўсе поле праблемнага артыкула, любы ўрывак тэксту або ўзмацняе яе, альбо аслабляе. Аргументацыя не з’яўляецца адасобленай структурай у тэксце, наадварот, уся маўленчая структура ўдзельнічае ў яе стварэнні. Аднак, аргументацыя ў публіцыстычным тэксце не тоесна аргументацыі ў фармальнай логіцы і мае свае адметныя рысы, што і прасочваецца на прыкладзе праблемнага артыкула. Аргументацыя будуецца з выкарыстаннем такіх спосабаў, як тлумачэнне, дэдуктыўная і індуктыуная формы вываду, спалучэнне лінейнага і сілагістычнага размяшчэння довадаў, а таксама кульмінацыйнае і антыкульмінацыйнае іх чаргаванне.

Аргументацыя з’яўляецца дамінантнай структурай аналітыка-публіцыстычнага тэксту; яна перадумоўлівае логіка-кампазіцыйную структуру тэксту, а таксама і выбар лінгвастылістычных сродкаў. Таму пры вывучэнні публіцыстычнага тэксту першаснай павінна быць жанравая

струтура, запраграмаваная экстралінвістычнымі фактарамі і скіраваная мэтай і задачамі аўтара.

Навучанне пэўнай форме маўленчага выказвання (жанру) абапіраецца на агульную будову маўленчай дзейнасці, структура якой як у вуснай, так і ў пісьмовай форме складаецца з 4-х фаз – арыентацыі, планавання, рэалізацыі праграмы і кантролю. Усведамленне навучэнцамі названых этапаў маўленчай дзейнасці забяспечвае поспех напісання тэксту любога жанру. Перш за ўсе вучні павінны ўсвядоміць асаблівасці камунікатыўнай сітуацыі, якая перадумоўлівае тыповыя спосабы маўленчых дзеянняў і выкарыстанне характэрных для абранага жанру структурных элементаў. Зыходзячы з таго, што ў тыповых маўленчых сітуацыях маўленчая дзейнасць рэалізуецца тыповымі спосабамі, якія фарміруюць звязны тэкст, лічым мэтазгодным вывучаць аналітычную публіцыстыку на аснове паняцця аргументацыі. Дарэчы, аргументацыя з’яўляецца асновай выказвання ў спрэчцы, дыскусіі, асновай любога жанру, у якім дамінуе тып мовы разважанне.

Фарміраванне камунікатыўных уменняў – працэс, які патрабуе дасканалай тэарэтычнай падрыхтоўкі вучняў. Першаснае замацаванне атрыманых ведаў аб жанры выказвання ў цэлым і аналітычных жанрах публіцыстыкі ў прыватнасці, аб паняцці аргументацыя і яе элементах магчыма ажыццявіць з дапамогай практыкаванняў рэцэптыўнага характару. Напрыклад, суаднесці форму аналізуемага тэксту з мэтавай устаноўкай аўтара, вылучыць структурныя элементы тэксту, устанавіць адрозненні паміж тэкстамі розных жанраў, вызначыць элементы аргументацыі тэксту і інш. Замацаванне тэарэтычных паняццяў адбываецца напачатку ў ходзе работы вучняў з тэкстам-узорам, затым у паэтапнай дзейнасці па стварэнні ўласных тэкстаў зададзенага жанру. Вывучэнне магчымасцяў мовы і маўлення і засваенне вучнямі спосабаў стварэння тэксту магчыма ажыццявіць з дапамогай сістэмы практыкаванняў, якія класіфікуюцца паводле відаў дзейнасці навучэнцаў – аналітычнай, рэпрадуктыўнай, аналітыка-сінтэтычнай і прадуктыўнай дзейнасці.

Аналітычная дзейнасць вучняў арганізуецца такімі відамі работ, як камунікатыўны аналіз сказа, складанага сінтаксінага цэлага, частковы і поўны аналіз тэксту і рэалізуецца ў наступных кірунках:

а) камунікатыўным: выяўленне мэты і задач аўтара, вызначэнне формы арганізацыі матэрыяла;

б) кампазіцыйна-зместавым: адказы на пытанні па зместу тэксту, фармулёўка асноўнай думкі тэксту, галоўнай праблемы і яе аспектаў; сціслая перадача зместу тэксту (у некалькіх сказах); тлумачэнне загалоўка, вызначэнне структурных элементаў жанру і складанне кампазіцыйных схем, састаўленне плпна тэксту, вылучэнне элементаў аргументацыі (тэзіс, аргументы, вывад) і ўстанаўленне характару адносін паміж імі (спосаб аргументацыі па форме вываду, размяшчэнню аргументаў і інш.);

в) моўным і маўленчым: вызначэнне стылістычнай афарбоўкі моўных сродкаў тэксту, дамінанты тыпа мовы, тлумачэнне асобных моўных адзінак.

Рэпрадуктыўная дзейнасць вучняў можа быць арганізавана з дапамогай свабодных дыктантаў, дыктантаў з творчым заданнем і пераказаў.

Матэрыялам для аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці навучэнцаў могуць быць практыкаванні, арыентаваныя на пераход ад працы з тэкстам-узорам да стварэння ўласнага тэксту. Напрыклад, трансфармацыя сказаў, складанага сінтаксічнага цэлага або тэксту ў адпаведнасці з заданнем: сфармуляваць праблемнае пытанне, даказаць тэзіс на падставе прыведзенай інфармацыі, абвергнуць тэзіс, пераўтварыць дэдуктыўны ход развіжання ў індуктыўны і наадварот і г. д.

Прадуктыўны характар дзейнасці рэалізуецца на творчым этапе, калі вучні пішуць тэкст у межах дадзенага жанру на аснове набытых ведаў і сфарміраваных камунікатыўных уменняў. Настаўнік вызначае агульны падыход або асноўныя кірункі творчай дзейнасці: а) ідэя тэксту; б) збор матэрыялу, у тым ліку фактычнага; в) аналіз матэрыяла і складанне плана; г) праца над чарнавікам; д) рэдагаванне тэксту. Работа вучняў (самастойная або сумесная з настаўнікам) скіравана, па-першае, на аналіз маўленчай сітуацыі, усведамленне ў гэтым кантэксце функцый і задач жанру. Па-другое, на дадзеным этапе прадугледжваецца планаванне цэлага тэксту ў межах жанравай абумоўленасці, г. зн. адбор канструктыўных прыёмаў, моўных сродкаў і агульнай танальнасці выказвання. Па-трэцяе, работа скіравана на рэалізацыю праграмы ў моўным кодзе і на ўдасканаленне напісанага, што абумоўлівае розныя формы арфаграфічнай, сінтаксічнай, лексіка-стылістычнай і пунктуацыйнай работы (рассяроджанай у асноўным).

Прапанаваная методыка вывучэння публіцыстычнага стылю ўлічвае жанрава-стылёвыя асаблівасці тэкстаў і абапіраецца на тэорыю паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў П.Я. Гальперына – Н.Ф. Талызінай. Як падкрэслівае Н.Ф. Талызіна, замест дзвюх праблем – перадаць веды і

сфарміраваць уменні і навыкі іх прымянення – перад навучаннем зараз стаіць адна: сфарміраваць такія віды дзейнасці, якія з самага пачатку ўключаюць веды і забяспечваюць іх прымяненне ў загадзя прадугледжаных межах [1, с. 43].

**Літаратура**

1. Талызина Н.Ф. Управление процессом усвоения знаний: Психологическая основа. М., 1984. 344 с.

**С.С. Мароз, М.С. Ржавуцкая**

## АРЫГІНАЛ І ПЕРАКЛАД ЯК АБ’ЕКТ ВЫВУЧЭННЯ НА ЗАНЯТКАХ ПА СПЕЦКУРСЕ

Асноўная задача, якая стаіць перад выкладчыкамі ВНУ – падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў. Таму выкладанне разнастайных спецыяльных дысцыплін застаецца неабходным і надзвычай актуальным, паколькі паглыбляе і ўдасканальвае веды, уменні і навыкі, набытыя на асноўных курсах. Важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў як навукоўцаў, даследчыкаў адводзіцца спецкурсам. Агульнавядома, працэс навучання ў вышэйшай школе на сучасным этапе яе развіцця ўсё ў большай ступені абапіраецца на самастойную працу студэнтаў, набывае навукова-даследчы характар. Спецкурс дае магчымасць выпрацоўваць у студэнтаў-філолагаў навыкі самастойнай даследчай працы, стымулюе пазнавальную дзейнасць, садзейнічае праяўленню ініцыятывы, спрыяе актывізацыі працэсу навучання. На спецкурсе выкладчык знаёміць студэнтаў не толькі з агульнапрынятымі, але і з дыскусійнымі пытаннямі, што садзейнічае замацаванню ўмення выказваць уласныя думкі, выпрацоўвае навыкі іх належнага абгрунтавання.

Навучанне ва ўмовах білінгвізму ставіць неабходнасць распрацоўкі спецкурсаў, звязаных з пытаннямі ўзаемадзеяння беларускай і рускай моў у сферы мастацкай творчасці.

Спецкурс “Асновы тэорыі і практыкі мастацкага перакладу з блізкароднасных моў” мае на мэце не толькі даць студэнтам трывалыя веды па разнастайных аспектах перакладазнаўства, але і замацаваць звесткі аб спецыфічных асаблівасцях лексічнай і граматычнай сістэм беларускай і рускай моў.